Министерство образования Республики Беларусь

Учреждение образования
«Белорусский государственный педагогический университет
имени Максима Танка»

Исторический факультет

# АКТУАЛЬНЫЕ ПРОБЛЕМЫ
# СОЦИАЛЬНО-ГУМАНИТАРНОГО ЗНАНИЯ

Материалы III Международной студенческой
научно-теоретической конференции

Минск, 18 апреля 2018 г.

Минск
РИВШ
2018

УДК 378.14:30(061.3)
ББК 74.58:60
А43

Р е к о м е н д о в а н о
советом исторического факультета
УО «Белорусский государственный педагогический
университет имени Максима Танка»
(протокол № 8 от 29 марта 2018 г.)

Р е д а к ц и о н н а я к о л л е г и я :
кандидат исторических наук доцент *А. В. Касович* (отв. ред.);
кандидат исторических наук доцент *С. П. Шупляк;*
кандидат педагогических наук доцент *А. А. Корзюк;*
кандидат исторических наук доцент *А. Ф. Великий*

Р е ц е н з е н т ы :
доктор исторических наук профессор *А. М. Лютый;*
доктор исторических наук профессор *И. В. Варивончик*

А43 **Актуальные** проблемы социально-гуманитарного знания : материалы III Междунар. студ. науч.-теорет. конф., Минск, 18 апр. 2018 г. / редкол.: А. В. Касович (отв. ред.) [и др.]; Белорус. гос. пед. ун-т им. М. Танка. – Минск : РИВШ, 2018. – 246 с.

ISBN 978-985-586-129-5.

В сборнике представлены материалы исследований молодых ученых высших учебных заведений Республики Беларусь и Российской Федерации, учащихся учреждений общего среднего образования, посвященные актуальным проблемам исторических, педагогических и социально-гуманитарных научных дисциплин.

Адресуется преподавателям, магистрантам и студентам вузов.

**УДК 378.14:30(061.3)**
**ББК 74.58:60**

**ISBN 978-985-586-129-5**

© Оформление. ГУО «Республиканский институт высшей школы», 2018

вялікую патрэбу і зацікаўленасць у ёй выказала жаночая гімназія ў Рабцы (Польшча), дзе ён таксама пачаў выкладаць.
Генрых Глябовіч не толькі вёў душпастырскую дзейнасць, але таксама працаваў у справах падрыхтоўкі кадраў Віленскага гарнізона. Сумесна з доктарам Дабжаньскім выдаваў штомесячнік “Jutro Polski” (“Заўтра Польшчы”), які выходзіў накладам 300–500 асобнікаў [1, с. 124].
Пасля 20 верасня 1941 г. па просьбе арцыбіскупа Р. Ялбжыкоўскага быў накіраваны з іншымі святарамі (беларусамі Станіславам Глякоўскім, Дзянісам Мальцам, Казімірам Рыбалтоўскім і палякамі Вітольдам Рорухам, Антонам Святаполк-Мірскім) на кананічную місію ў акупаваную нямецка-фашысцкімі захопнікамі БССР. Служыў пробашчам у касцёлах Святога Дамініка ў в. Хатаевічы (цяпер в. Акцябр Лагойскага р-на Мінскай вобласці), Унебаўзяцця Найсвяцейшай Панны Марыі ў в. Корань, Святога Міхала Арханёла ў в. Акалова (Лагойскага р-на, Мінскай вобласці). На Міншчыне ксёндз Генрых бясстрашна і самаахвярна арганізоўваў рэлігійнае жыццё мясцовых жыхароў, не звяртаючы ўвагу на палітычнае становішча. За сваю душпастырскую і місіянерскую дзейнасць быў абвінавачваны ў паланізацыі, за што 7 лістапада 1941 г. быў арыштаваны гестапа і расстрэляны як польскі агент у лесе каля Барысава. На жаль, месца пахавання ксяндза Глябовіча не знойдзена да нашых дзён. 13 чэрвеня 1999 г. папа Ян Павел II дадаў (беатыфікаваў) ксяндза Генрыха Глябовіча да ліку Благаслаўлёных у групе з 108 мучанікаў [2, с. 19].
Генрых Глябовіч з’яўляецца яскравым прыкладам мужнасці і веры. Ён ніколі не саромеўся таго, чым займаўся, а займаўся ён пошукам людзей, якія яшчэ не пазналі Бога, або адышлі ад Яго. І быў расстраляны за сваю веру, за абвяшчэнне Хвалы Божай. Але трэба ведаць, што дзякуючы такім пастырам, іх уласным жыццёвым прыкладам, мы становімся ўсё больш свядомымі, і можам параканацца, што Божая воля застаецца назаўсёды.

*Літаратура*

1. Маракоў, Л. Рэпрэсаваныя каталіцкія духоўныя, кансэкраваныя і свецкія асобы Беларусі 1917–1964 гг. / Л. Маракоў. – Мінск : Смэлтак, 2009. – 775 с.
2. Сведкі любові Бога і чалавека / пер. з польск. С. Словік, Т. Гайко, Ж. Паходня. – пад. рэд. Камісіі СЕСВ па справах Новых Мучанікаў. – Гродна : Гродзенская Рыма-Каталіцкая дыяцэзія, 2000. – 96 с.

## АСВЕЙСКАЯ РАГЕДЫЯ: ДУХОЎНЫ ПОДЗВІГ БЛАГАСЛАЎЛЁНЫХ АЙЦОЎ МАРЫЯНАЎ АНТОНІЯ ЛЯШЧЭВІЧА І ЮРЫЯ КАШЫРЫ

*А.М. Доўнар, 2 курс, гістарычны факультэт, БДПУ, Мінск*
*нав. кір. – А.А. Корзюк, канд. пед. навук, дац., БДПУ*

У гады Вялікай Айчыннай вайны нямецка-фашыстскімі захопнікамі на тэрыторыі Беларусі праводзілася вялікая колькасць карных аперацый. Адной з падобных аперацый з’яўлялася “Зімняя чароўнасць”, якая была арганізавана для знішчэнняпартызанскага руху ў рэгіёне Віцебск – Асвея – Полацк.
16–18 лютага 1943 г. карнікі знішчылі вёску Росіца. Больш маладых і моцных людзей адправілі на станцыю Бігосава, дзе іх грузілі ў вагоны і везлі ў канцлагер Саласпілс і на прымусовую працу ў Германію. Астатнія жыхары былі спалены ў дамах. Вялікая група людзей была загнана ў кароўнік, які затым падпалілі. Сярод забітых былі каталіцкія святары Юрый Кашыра і Антоній Ляшчэвіч. Адзін з іх быў спалены з іншымі жыхарамі, а другі –застрэлены за настойлівыя просьбы выратаваць дзяцей (па іншых дадзеных – таксама спалены). У 1999 г. Папа рымскі Ян Павел II залічыў забітых святароў да ліку блажэнных. Хто ж былі гэтыя людзі, якія прынялі мучаніцкую смерць разам са сваімі вернікамі? У дадзеным артыкуле разгледзім іх служэнне і трагічны лёс больш падрабязней.
На тэрыторыі паўночнай Беларусі, на памежжы з Латвіяй, знаходзіцца в. Росіца, у якой на той час працавалі місіянеры айцы марыяне, якія былі накіраваны з в. Друя (там знаходзіўся вікарыяльны кляштар айцоў марыянаў на тэрыторыі Беларусі) Антоній Ляшчэвіч і Юрый Кашыра. У сувязі з тым, што большасць касцёлаў сучаснай Віцебскай дыяцэзіі (Віцебская вобласць) знаходзіліся без святароў, айцы марыяне Антоній і Юрый вырашылі правесці місіянерскую рэформу, якая была накіравана на аднаўленне касцёлаў і ўзнаўленне літургіі ў мясцовых храмах. Ініцыятарам місіянерства выступіў айцец Антоній Ляшчэвіч, да якога далучыліся іншыя ксяндзы-марыяне: айцец Фелікс Чачот, айцец Уладзіслаў Лашэўскі і клірык Генрых Тамашэўскі. Затым з друйскага кляштара сясцёр эўхарыстак на місіі таксама выехалі законныя сёстры Я. Віршута, К. Угарэнка, Р. Марцілёнак, А. Прытыцкая, Э. Воронька, Е. Трубіла, А. Мароз, П. Латышкевіч, А. Пяткун, М. Ясінская і іншыя. Асноўным цэнтрам развіцця місіянерства лічылася в. Росіца, да якой і былі накіраваны айцы Антоній і Юрый.
Айцец Юрый Кашыра нарадзіўся 4 красавіка 1904 г. у сям’і Тадэвуша і Марыі Кашыры, якія жылі ў в. Аляксандрава на Мёршчыне. Сям’я Кашыраў была праваслаўнай, таму Юрый атрымаў Сакрамэнт Хросту па праваслаўнаму абраду. У дзяцінстве Юрый страціў сваіх бацькоў. Аднак ён скончыў тры класы ў Друі і пачаў працаваць у маёнтку разам са сваімі апекунамі.

Юнацтва Юрыя не абяцала яму вялікіх перспектыў на будучыню. Калі Кашыры споўнілася дзявятнаццаць гадоў, у Друі пачаў працаваць кляштар айцоў марыянаў, аднoўлены благаслаўлёным Юрыем Матулевічам. Ён з'яўляўся аднавіцелем ордэну айцоў марыянаў і біскупам Віленскай дыяцэзіі. Юрый Кашыра пайшоў у новаўтвораны кляштар марыянаў, дзе прайшоў пастулат і навіцыят (два гады падрыхтоўкі да манскага кансэкраванага жыцця). 31 кастрычніка 1929 г. ён прыбыў у калегіум на Piazza S. Nicola daTolentino і распачаў вучобу на філасофскім факультэце Папскага ўніверсітэта Angelicum [2, с. 9].

Айцец Антоній Ляшчэвіч нарадзіўся 18 (30) верасня 1890 г. у каталіцкай сям'і у в. Абрамаўшчына Віленскай губерніі (цяпер Смаргонскі раён Гродзенскай вобласці. У час з 1902 па 1908 гг. вучыўся ў прыватнай гімназіі пры касцёле святой Кацярыны ў Санкт-Пецярбургу. Ніжэйшае свячэнне атрымаў 14 кастрычніка 1912 г., субдыяканат і дыяканат – у 1913 г. За сваё адукаванае жыццё будучы ксёндз Антоній вучыўся таксама ў Магілёўскай духоўнай семінары (1914 г.), працаваў вікарыем у парафіі Унебаўзяцця Найсвяцейшай Панны Марыі ў Іркуцку, быў прэфектам дзвюх рускіх і адной польскай сярэдняй школы, выкладчыкам лацінскай мовы ў адной з гімназій, прыняў службу пробашча парафіі святога Юзафа ў Харбіне (1924 г.). Пасля нядоўгага служэння святаром, ён вырашае паехаць у Рым, каб уступіць у ордэн айцоў марыянаў. У лютым 1938 г. айца Антонія залічылі ў манаскі мужчынскі ордэн айцоў марыянаў. Пасля прыняцця кансэкраваных абетаў, святар быў накіраваны ў Друю, дзе знаходзіўся ў кляштары марыянаў і працаваў аканомам. 3 лістапада 1941 г. быў прызначаны пробашчам парафіі Найсвяцейшай Тройцы ў в. Росіца [1, с. 262].

У чэрвені 1942 г. у касцёльным жыцці Росіцы адбыліся змены. Айцец Чачот, які займаўся рамонтам касцёла ў Росіцы і дапамагаў у місіянерскай працы айцу Ляшчэвічу, быў вымушаны вярнуцца ў кляштар, які знаходзіўся ў Друі.

Праз восем месяцаў нацысты пачалі правядзенне карнай аперацыі за Дзвіной. Праз некалькі дзён атрад карнікаў дайшоў да Друі, але там надоўга не застаўся. Асноўнай мэтай аперацыібыло знішчэнне партызанскіх атрадаў і збор дзяцей у канцэнтрацыйны лагер Саласпілс, які знаходзіўся ў Латвіі. Сведка карнай аперыцыі сястра эўхарыстка Ядвіга Віршута ўспамінала: "У аўторак раніцай, 16 лютага 1943 г., пачалі біць званы. Немцы зганялі ў Росіцкі касцёл першыя групы людзей: матак з немаўлятамі, дзяцей, маладых і старых. Загналі туды і нас, законных сёстраў. У касцёле – плач, крык, роспач". Святары прасілі карнікаў каб, тыя адпусцілі дзяцей, але ім было адмоўлена. На наступны дзень захопнікі пачалі зганяць людзей у сарай. Разам з вернікамі на смерць пайшоў і айцец Антоній Ляшчэвіч, які быў спалены разам з людзьмі. На наступны дзень, калі пачалі другі этап знішчэння вескі, немцы застрэлілі і айца Юрыя Кашыру.

У памяць гэтых трагічных падзей у Росіцы, пачынаючы з 1999 г., штогод ладзяцца памятныя мерапрыемствы па ўшанаванні памяці благаслаўлёных айцоў марыянаў і ўсіх, хто загінуў падчас карнай аперацыі. У прыватнасці, 17 лютага 2018 г. на месцы трагічных падзей прайшлі мерапрыемствы, прымеркаваныя да 75-годдзя пачатку Асвейскай трагедыі. Адбыўся памятны мітынг, які ўзначаліў ардынарый Віцебскай дыяцэзіі біскуп Алег Буткевіч.

Такім чынам, на прыкладзе трагічных падзей у в. Росіца падчас карнай аперацыі "Зімняя чароўнасць", становіцца зразумелым, што каталіцкія святары па меры сваіх магчымасцяў уносілі пэўны ўклад у барацьбу з нямецка-фашысцкімі захопнікамі, імкнучыся выратаваць мірных жыхароў і выконваючы ахвярнае служэнне на карысць Касцёла і людзей.


*Літаратура*

1. Маракоў, Л. Рэпрэсаваныя каталіцкія духоўныя, кансэкраваныя і свецкія асобы Беларусі 1917–1964 гг. / Л. Маракоў. – Мінск : Смэлтак, 2009. – 775 с.
2. Пялінак, В. Росіцкія мучанікі / В. Пялінак. – Росіца : Касцёл Св. Тройцы, 1999. – 43 с.


## ЭТАПЫ СТАНОВЛЕНИЯ ГРОДНЕНСКОГО ТЕЛЕРАДИОВЕЩАТЕЛЬНОГО КАНАЛА «ГРОДНО ПЛЮС»


*А.Д. Езепчик, 3 курс, ФИКиТ, ГрГУ, Гродно*

*науч. рук. – И.И. Минчук, канд. фил. наук, ГрГУ*


Образ жизни современного человека значительно изменился за последние десятилетия. Определяющими для каждого индивида являются не только временное и географическое пространства, но и медиапространство, которое активно развивается и наращивает свои объемы в к. XX – н. XXI вв. Для того чтобы благополучно существовать в новых условиях, важно знать и понимать процессы, происходящие в пространстве медиа. Это необходимо не только создателям медиапродукта, но и его потребителям.

Вопрос медиаобразования общества становится актуальным уже во второй половине XX в. Российский исследователь А.В. Фёдоров рассматривает медиаобразование «как процесс развития личности с помощью и на материале средств массовой коммуникации (медиа) с целью формирования культуры общения с медиа, творческих, коммуникативных способностей, критического мышления, умений полноценного восприятия, интерпретации, анализа и оценки медиатекстов, обучения различным формам самовыражения при помощи медиатехники» [1, с. 8].